МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

## ЗАГАД

## ПРИКАЗ

28.05.2025 № 86

г. Мінск

г. Минск

Аб выніках XXXIII рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры»

На падставе пункта 18 Інструкцыі аб парадку правядзення рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры», зацверджанай пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2007 г. № 52, і пратакола пасяджэння журы XXXIII рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» ад 14.05.2025 № 1,

ЗАГАДВАЮ:

1. Узнагародзіць пераможцаў XXXIII рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» (далей – конкурс):

1.1. у намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем»:

1.1.1. дыпломамі першай ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 50 базавых велічынь:

Цэнтральную бібліятэку імя Янкі Купалы дзяржаўнай ўстановы «Цэнтралізаваная сістэма дзяржаўных публічных бібліятэк г.Мінска»;

філіял «Міхалішкаўская сельская бібліятэка» дзяржаўнай установы культуры «Астравецкая раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці;

1.1.2. дыпломамі другой ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 40 базавых велічынь:

філіял «Гарадская бібліятэка № 1» дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Асіповіцкага раёна» Магілёўскай вобласці;

Пелішчанскую сельскую бібліятэку-філіял № 25 дзяржаўнай установы культуры «Камянецкая раённая бібліятэчная сістэма» Брэсцкай вобласці;

1.1.3. дыпломамі трэцяй ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 30 базавых велічынь:

Зак. 569.

філіял гарадская дзіцячая бібліятэка № 4 дзяржаўнай установы культуры «Мазырская цэнтральная раённая бібліятэка імя А.С.Пушкіна» Гомельскай вобласці;

філіял «Бібліятэка-клуб Забор'е» дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Расонскага раёна» Віцебскай вобласці;

1.2. у намінацыі «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»:

1.2.1. дыпломамі першай ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 50 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову культуры «Мастоўская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці;

філіял «Інтэграваная бібліятэка аграгарадка Вялікія Шылавічы» дзяржаўнай установы культуры «Слонімская раённая бібліятэка імя Я.Коласа» Гродзенскай вобласці;

1.2.2. дыпломам другой ступені і грашовай прэміяй ў памеры 40 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову культуры «Іванаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф.І.Парфёнава» Брэсцкай вобласці;

Краснаслабодскую гарпасялковую экалагічную бібліятэку-філіял № 5 дзяржаўнай установы культуры «Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка» Мінскай вобласці;

1.3. у намінацыі «За пошукавую і даследчую працу»:

1.3.1. дыпломамі першай ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 50 базавых велічынь:

Цэнтральную бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Бібліятэчная сетка Клічаўскага раёна» Магілёўскай вобласці;

філіял «Вастраўская сельская бібліятэка» дзяржаўнай установы культуры «Ляхавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Брэсцкай вобласці;

1.3.2. дыпломамі другой ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 40 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову культуры «Нясвіжская цэнтральная раённая бібліятэка імя Паўлюка Пранузы» Мінскай вобласці;

Жалудоцкую гарпасялковую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі» Гродзенскай вобласці;

1.3.3. дыпломамі трэцяй ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 30 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову культуры «Навагрудская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці;

Бялынкавіцкую сельскую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Бібліятэчная сетка Касцюковіцкага раёна» Магілёўскай вобласці;

1.4. у намінацыі «За падтрымку і развіццё чытання»:

1.4.1. дыпломамі першай ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 50 базавых велічынь:

Раённую цэнтральную бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Нараўлянская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма імя Давіда Сімановіча» Гомельскай вобласці;

філіял «Палужская сельская бібліятэка» дзяржаўнай установы культуры «Карэліцкая раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці;

1.4.2. дыпломамі другой ступені і грашовымі прэміямі ў памеры 40 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову культуры «Брэсцкая цэнтральная гарадская бібліятэка імя А.С.Пушкіна» Брэсцкай вобласці;

1.4.3. дыпломам трэцяй ступені і грашовай прэміяй у памеры 30 базавых велічынь:

дзяржаўную ўстанову культуры «Смаргонская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці.

2. Дзяржаўнай установе «Нацыянальная бібліятэка Беларусі» забяспечыць выплату грашовых прэмій названым у пункце 1 гэтага загаду бібліятэкам за кошт сродкаў, прадугледжаных Міністэрству культуры на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2021-2025 гг. (падпраграма «Мастацтва і творчасць»).

Міністр Р.І.Чарнецкі